

«НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ТЭАТРАЛЬНАЙ ПРЭМІЯЙ» АДЗНАЧАНЫ **4**

СКАРБЫ СЯЛІБ, ЯКІЯ ЗНІКАЮЦЬ **5**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

26 СНЕЖНЯ 2018 г. СЕРАДА № 248 (28864)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валерый МАЛАШКА, міністр аховы здароўя:**

*«Мы спецыяльна пайшлі на павелічэнне часу прыёму, каб урач агульнай практыкі атрымаў магчымасць у больш спакойнай абстаноўцы правесці абследаванне хворага, пагутарыць з ім. Чаму? Таму што гэта ўрач з зусім новымі і больш шырокімі кампетэнцыямі. Гэта ўрач, які сёння валодае не толькі ведамі, але і неабходным медыцынскім абсталяваннем, каб правесці вартаснае абследаванне. У чым мая ўпэўненасць, што чэргі не вырастуць? Мы сёння гаворым не толькі аб трансфармацыі тэрапеўта ва ўрача агульнай практыкі, мы сёння фарміруем яго каманду. У гэтай камандзе не толькі медыцынская сястра, але і памочнік урача. Гэта досыць граматны спецыяліст з сярэдняй медыцынскай адукацыяй, які ў першую чаргу возьме на сябе работу з цэлым шэрагам руцінных пытанняў, што раней вырашаў урач. Думаю, усё гэта значна палепшыць імідж першаснага звяна аховы здароўя».*

# УСЕ ПРАБЛЕМЫ ВЫРАШАЛЬНЫЯ



Фота БелТА.

### Пра гэта падчас перагавораў у Маскве заявілі Прэзідэнты Беларусі і Расіі Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін

**Кіраўнік беларускай дзяржавы пагадзіўся са словамі расійскага лідара наконт таго, што, улічваючы аб'ём рознабаковага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі, непазбежна ўзнікаюць і праблемныя моманты. «Будзем гаварыць шчыра, ні ў кога няма такіх блізкіх і цесных адносін, як у беларусаў і расіян. Натуральна, мы рухаемся наперад, і на гэтым шляху ўзнікаюць пэўныя праблемы. Але яны не супастаўныя з тымі дасягненнямі, якія вы пералічылі ў лічбах», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.**

«Мы сапраўды можам дамовіцца, таму што каманды, якія з намі тут знаходзяцца, правялі шэраг раўндаў перагавораў. Яны ведаюць праблемы, ды і мы з вамі ўжо глыбока азнаёмлены з тымі пытаннямі, якія трэба сёння вырашыць. Хацелася б, каб мы вырашылі гэтыя пытанні і ў новы год не цягнулі старыя праблемы», — сказаў Прэзідэнт нашай краіны.

**СТАР. 2**

# У САМЫХ НАДЗЕЙНЫХ РУКАХ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Павел САЛАНКО з сынам Станіславам, якому споўніўся адзін год, катаюцца на зімняй горцы ў Лошыцкім парку сталіцы.

## КОРАТКА

- **Казачная рэзідэнцыя Дзеда Мароза адкрылася 25 снежня на плошчы імя Леніна ў Гомелі.**
- Пераможца X сезона рэспубліканскага конкурсу Social Weekend праект «Вестачка» сумесна з фондам «Добра» запусцілі акцыю і прапануюць адправіць паштоўкі людзям, якія сустракаюць Новы год у адзіноце.
- **Алея крэатыўных навагодніх ёлак адкрылася ў парку імя Жылібера ў Гродне пры садзейнічанні аддзела культуры гарвыканкама.**






# НОВЫ ГОД БЕЗ ТУРБОТ

### Як выбраць і ўпрыгожыць святочнае дрэва?

**Напрыканцы мінулага тыдня па краіне актыўна запрацавалі адмысловыя елачныя кірмашы, на якіх можна набыць навагоднюю прыгажуню. Але ў атмасферы свята варта не забываць пра бяспеку. Пажары з-за елак у Беларусі апошнім часам амаль не сустракаюцца. Разам з тым быць асцярожнымі ўсё роўна патрэбна. Менавіта таму напярэдадні свята ратавальнікі нагадалі пра тое, якім павінна быць святочнае дрэва з проціпажарнага пункту гледжання.**

### Натуральная або штучная?

Падчас выбару жывога дрэва ёсць свае асаблівасці. Яго мусілі ссекчы нядаўна. Гэта значыць, што елка яшчэ мае гнуткія і трывалыя галінкі, ад яе добра пахне, а хвоя афарбавана ў насычаны зялёны колер. Іголкі навобмацак у такога дрэўца крыху масляністыя. Калі ж елка мае відавочна тоненькі ствол, пажухлыя іголкі, а галінкі лёгка ламаюцца — значыць, яна прастаіць вельмі нядоўга і асыплецца праз дзень-два.

Ёсць і яшчэ адна асаблівасць падчас транспарціроўкі натуральных елак. Надвор'е ў нашых краях гэтай зімой пераменлівае. Маразы ў 10—12 градусаў па Цэльсію змяняюцца літаральна за адны суткі адлігай. Таму калі ртутны слупок апускаецца ніжэй за нуль, то перш чым уносіць елку ў цёплую хату, лепш яе вытрымаць колькі часу ў пад'ездзе шматпавярховіка або ў сенцах. Перапад тэмператур у гэтым разе будзе не такі істотны, дрэва адтае, што палепшыць трываласць елкі.

**СТАР. 3**

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

**ПАДПІШЫСЯ — І ВЫЙГРАЙ!**

**Працягваецца падпіска на «Звязду» на І квартал і І паўгоддзе 2019 года!**

**ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!**

# УСЕ ПРАБЛЕМЫ ВЫРАШАЛЬНЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У цэлым ён выказаў упэўненасць, што бакі знойдуць рашэнні ў імя беларусаў і расіян.

Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў нядаўнюю прэс-канферэнцыю Уладзіміра Пуціна, назваўшы яе добрай размовай з расіянамі. Ён падкрэсліў, што пазначаныя на мерапрыемстве тэмы важныя і для Беларусі, паколькі краіны ўцягнутыя ў агульныя сусветныя праблемы. «Калі ў нас ёсць нейкія праблемы — давайце будзем шчырыя, што яны часам нараджаюцца не тут, не намі, мы ўцягнутыя ў гэты глабальны працэс. Таму праблемы, якія складваюцца ў сусветным гандлі, эканоміцы, палітыцы, ваенных пытаннях, так ці інакш датычацца нас. Але іх трэба вырашаць», — адзначыў беларускі лідар.

«У нас ёсць усе падставы быць задаволенымі тым, што ў нас адбываецца ў двухбаковых адносінах, і неабходна зрабіць усё для таго, каб ніякіх не было складанасцяў на будучыню. Нягледзячы на пытанні, якія ўзнікаюць у розных сферах, нам заўсёды з вамі ўдавалася знаходзіць рашэнні», — сказаў Уладзімір Пуцін.

Напярэдадні візіту ў Маскву Аляксандр Лукашэнка правёў нараду з удзелам кіраўніцтва ўрада па актуальных пытаннях супрацоўніцтва з Расіяй.

«Мы заўсёды падкрэслівалі значнасць гэтага ўзаемадзеяння. Усебаковы характар нашых адносінаў мае сур'ёзнае значэнне не толькі для Беларусі, але таксама і для Расіі. Яны будуюцца на сістэмнай і, самае галоўнае, планавай аснове», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён патлумачыў, што ўсе рашэнні прынятыя: і на Вышэйшым дзяржаўным савеце Саюзнай дзяржавы, і на саюзным Саўміне, і ў іншых фарматах.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу: «Мы шчыльна наблізіліся да стварэння адзінага паліўна-энергетычнага рынку, ідзём да фарміравання агульнай прававой прасторы Саюзнай дзяржавы». Ён нагадаў, што ў сярэдзіне гэтага года абедзве краіны павінны былі пачаць вырашаць пытанні па цэнах на газ, а таксама па нафце ў сувязі з падатковым манёўрам Расіі. Аднак тэрміны былі сарваныя. На перагаворах у Маскве ў тым ліку гэта стала адной з тэм абмеркавання.

**Надзея АНІСОВІЧ, БелТА.**

## «Камуналка» падаражэе ў межах пяці долараў

**У Беларусі ўстаноўлены тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі для насельніцтва на наступны год. Адпаведны ўказ падпісаў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, паведамілі ў прэсслужбе кіраўніка дзяржавы.**

У выніку прымянення зацверджаных тарыфаў жыллёва-камунальныя плацяжы для насельніцтва, у разліку на тыпавую двухпакаёвую кватэру з трыма жыхарамі пры нарматыўным спажыванні імі паслуг, падвысяцца ў межах пяці долараў.

Тарыфы будуць павышацца ў два этапы. З 1 студзеня вырастуць (сумарна на 3,9 долара) тарыфы на паслугі газа-, электра- і водазабеспячэння, водаадвядзення, па капітальным рамонце, санітарным утрыманні дапаможных памяшканняў жылога дома, памеры кампенсацыі выдаткаў на электраэнергію.

З 1 чэрвеня, пасля завяршэння ацяпляльнага сезона, тарыф на паслугі цеплазабеспячэння для патрэб ацяплення і гарачага водазабеспячэння будзе павышаны на 1,1 долара. Тарыфы на тэхнічнае абслугоўванне жылога дома, ліфта, абыходжанне з цвёрдымі камунальнымі адходамі захоўваюцца на ўзроўні 2018 года.

**Ул. інф.**

Блізкая ўлада

# ЖЫЛЛЁ, ПАРКОЎКІ І СВЯТОЧНАЯ ЁЛКА

**Падчас прамой лініі старшыні Мінгарвыканкама Анатоля СІВАКА былі падняты такія пытанні, як завяршэнне будаўніцтва праблемных жылых дамоў ТАА «Тамбаз», абмежаванне паркоўкі старонняга транспарту ў дварах, будаўніцтва новых аб'ектаў, перадае БелТА.**



Адразу тры званкі паступілі на прамую лінію з пытаннямі аб дамах, забудоўшчыкам па якім выступала ТАА «Тамбаз». Іх зараз будзе дабудоўваць УКБ Савецкага раёна, механізм вызначаны ўказам Прэзідэнта. Але людзі асцерагаюцца, што не змогуць даплаціць неабходную суму за свае кватэры, і цікавяцца, як быць у такой сітуацыі і як будуць забяспечаны інтарэсы тых, хто не атрымае страхавых ўзносы. Анатоль Сівак запэўніў, што сітуацыя з «Тамбазам» знаходзіцца на кантролі ў Мінгарвыканкаме. Па гэтай тэме плануецца правесці нараду. Пасля яго арганізуюць сустрэчу з ініцыятыўнай групай трымальнікаў аблігацый.

Пытанне ад жыхаркі Мінска датычылася паркоўкі ў двары. Не сакрэт, што ў сталіцы гэтая праблема асабліва актуальная. Жанчына паведаміла, што ў іх двары на вуліцы Леніна паркуюцца ўсе, каму шкада аддаваць грошы за паркоўку ў цэнтры. У выніку самім жыхарам няма дзе ставіць машыны, а экстранныя і камунальныя службы не заўсёды могуць праехаць. Старшыня Мінгарвыканкама заўважыў, што з паркоўкай у дварах у горадзе сапраўды ёсць праблема. І яна патрабуе комплекснага вырашэння. Проста ўсталяваць шлагбаум не заўсёды дастаткова. — Мы дапаможам вам вырашыць праблему, і на вашым прыкладзе паспрабуем выбудаваць механізм дзеянняў у аналагічных сітуацыях для ўсяго горада, — сказаў Анатоль Сівак.

Некалькі зваротаў датычыліся планаў па будаўніцтве новых аб'ектаў. Гараджанка з вуліцы Рафіева расказала, што на іх вуліцы на месцы яблыневага саду прапануецца пабудаваць гандлёва-забаўляльны цэнтр, а жыхары просяць захаваць зялёную зону. Старшыня Мінгарвыканкама паабяцаў асабіста выехаць на месца і разабрацца ў сітуацыі. Ён таксама звярнуў увагу на тое, што неабходна ў цэлым прааналізаваць патрэбнасць горада ў гандлёва-забаўляльных цэнтрах. Як паказвае практыка, з прычыны фінансавых цяжкасцяў інвестараў некаторыя з іх не дабудоўваюцца гадамі. Пустуюць плошчы і ў тых аб'ектах, якія ўжо функцыянуюць.

Жыхарка дома, размешчанага па вуліцы Герасіменкі паблізу кальцавой аўтадарогі, паскардзілася на шум ад машын. Нядаўна побач пабудавалі аўтазапраўку, жыхарам паабяцалі ў перспектыве вырашыць праблему: усталяваць шумаахоўны экран і замяніць вокны ў кватэрах на шуманепранікальныя. Але распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі запланавана толькі на 2020 год.

— Паскорым гэты працэс і дадатковa паглядзім, наколькі эфектыўны прапанаваныя мерапрыемствы, — адзначыў Анатоль Сівак.

Таксама мінчане прасілі ўдзяліць увагу азеляненню тэрыторый. У адказ Анатоль Сівак падзяліўся планамі высаджваць у горадзе больш зялёных насаджэнняў.

— У вясновы і восеньскі перыяды будзем дастаўляць саджанцы і прапаноўваць мясцовым жыхарам прыняць удзел у пасадках. Бо калі чалавек нешта робіць сваімі рукамі, у яго стаўленне іншае, — мяркуе ён.

Гучалі прапановы ўсталёўваць на Кастрычніцкай плошчы жывую елку замест штучнай, зрабіць званкі з мабільнага тэлефона ў службу 115 (кантакт-цэнтр ЖКГ) бясплатнымі, падымаліся пытанні капітальнага рамонту жылля, добраўпарадкавання прыдамавой тэрыторыі і іншыя.

Усяго падчас прамой лініі прынята амаль паўсотні званкоў.

# СЛУХАЕ ГУБЕРНАТАР...

**У мінулую суботу на прамую лінію старшыні Віцебскага аблвыканкама Мікалаю ШАРСНЁВУ патэлефанавалі дваццаць чалавек.**



Фота Аляксея СПАТКАЯ.

Два заяўнікі з Сенненскага раёна расказалі губернатару, што ўжо два месяцы чакаюць зарплату. Завінавацілася сельскагаспадарчая арганізацыя. Губернатар даручыў пад асабістую адказнасць старшыні райвыканкама паслядзіць... ля выхадных становіча вырашыць пытанне. І ніякія апраўданні, аргументы супраць гэтага рашэння прымацца не будуць.

Вельмі актыўным быў жыхар аграгарадка Жарнасекі Полацкага раёна, які агучыў некалькі пытанняў. У прыватнасці, мужчына не разумее, чаму трэба плаціць за ваду, якая падаецца з калонак. Губернатар растлумачыў, што час, калі ўсё было бясплатна, прайшоў. Паскардзіўся заяўнік і на тое, што закрылі лазню. Між іншым, для жыхароў глыбінкі арганізоўваюць паездку ў лазню ў Полацк. І плаціць за праезд не трэба. Цікава, што да такога важу ў райцэнтр дадаецца ляўчэ і адвоз па пакупкі ў краму. Вясковец таксама прасіў паспрыяць, каб не закрылі аўтамабільную запраўку і аддзяленне банка. Гэтыя сітуацыі будуць вывучацца. Верагодна, пойдуць насустрач пажаданням людзей. Выказаў мужчына абурэнне і тым, што зачынілі будынак чыгуначнай станцыі ў суседнім населеным пункце. Высветлілася, што апошняе адбылося з-за невялікай колькасці пасажыраў...

Жыхарка Оршы агучыла сваю праблему: на ўскраіне, дзе яна жыве, няма крамы. Прыходзіцца пенсіянеркам доўга дабірацца на аўтобусе ў цэнтр. Губернатар даручыў паспрыяць у вырашэнні праблемы. Можа, нехта з прыватнікаў пажадае адкрыць невялікі гандлёвы пункт? Жыхар таго ж райцэнтра канстатаваў, што дрэнна прыбіраюць пад'езды і двор шматпавярховікі.

Патэлефанавала жанчына з абласнога цэнтра — сказала, што ў кватэры цвіль, а каб з крана пацякла гарачая вада, трэба доўга зліваць халодную. Кіраўнік абласной арганізацыі ЖКГ, які прысутнічаў на мерапрыемстве, растлумачыў, што ў такіх дамах старая сістэма водазабеспячэння, таму выхад — у яе замене. Гэта будзе зроблена з часам і не толькі ў адным доме.

Яшчэ адна жыхарка Віцебска паведаміла, што зламала руку, калі паслізнулася, бо ў прыватным сектары не падсыпалі пяском дарогу. Мэр горада, які выйшаў на сувязь, растлумачыў, што падсыпкай займаюцца ўсяго 15 аўто. Прызнаў, што на вуліцы з прыватнымі дамамі тыя машыны праязджаюць у апошнюю чаргу...

Пенсіянерка з гарадскога пасёлка Руба, які некалькі гадоў таму далучылі да Віцебска, паскардзілася, што памянялі нумары тэлефонаў неабходных ёй устаноў і арганізацый, а даведка службы 109 платная. Інтэрнэтам пажылая дама не карыстаецца, таму дзе ёй знайсці нумары? Губернатар даручыў прадстаўніку РУП «Белтэлекам» надрукаваць на паперы неабходную інфармацыю і прынесці жанчыне дамоў. Ды і іншым, хто мае ў гэтым патрэбу.

Чарговы раз высветлілася, што, у прынцыпе, бадай, пытанні маглі б вырашыць кіраўнікі мясцовай улады.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Колькасць ахвяр цунамі ў Інданезіі дасягнула 429



Колькасць загінулых у выніку моцнага цунамі ў Інданезіі працягвае расці. Паводле апошніх звестак, ахвяр ужо 429, паведамляе агенцтва «Сіньхуа» са спасылкай на прадстаўніка нацыянальнага Агенцтва па прадухіленні стыхійных бедстваў.

Аб колькасці пацярпелых новай інфармацыі пакуль няма. Напярэдадні інданезійскае агенцтва паведамляла, што іх 1459. Моцнае цунамі абрынулася на прыбярэжныя раёны астравоў Ява і Суматра ў ноч з 22 на 23 снежня. Яно магло ўзнікнуць з-за нядаўняга вывяржэння вулкана Кракатау.

### Суд ЗША прадпісаў Пхеньяну выплаціць $500 мільёнаў сям'і амерыканца

Амерыканскі суд прадпісаў ураду КНДР выплаціць кампенсацыю ў памеры $500 мільёнаў сям'і амерыканскага студэнта Ота Вамбіера, які памёр неўзабаве пасля вызвалення з паўночнакарэйскай турмы. Пра гэта паведаміў партал навін Axios са спасылкай на дакументы федэральнага суда сталічнай акругі Калумбія.

Сям'я Вамбіера падала іск супраць паўночнакарэйскіх улад у федэральны суд у федэральнай акрузе Калумбія ў красавіку гэтага года. Сваякі лічаць, што КНДР незаконна ўтрымлівала пад вартай і катавала Вамбіера, у выніку чаго ён памёр. Бацькі студэнта патрабавалі праз суд спагнаць з Пхеньяна крыху больш за 1 мільярд долараў кампенсацыі за гібель сына.

У студзені 2016 года Вамбіер падчас турыстычнай паездкі ў КНДР сарваў са сцяны паўночнакарэйскай гасцініцы палітычны плакат. Вярхоўны суд КНДР асудзіў яго да 15 гадоў турэмнага зняволення з адбываннем пакарання ў папраўча-працоўнай калоніі.

13 чэрвеня 2017 года Вамбіер быў вызвалены «з гуманных меркаванняў» і перададзены ЗША ў цяжкім стане. На радзіме ў яго дыягнаставалі цяжкае пашкоджанне аддзелаў галаўнога мозга і практычна незваротнае адміранне яго тканак. Неўзабаве ён памёр.

### Раскосмас расказаў аб тэрмінах знішчэння Зямлі Сонцам

Адзначаецца, што пасля выпрацоўкі большай часткі вадароду Сонца будзе разгарацца з новай сілай. Гэта прывядзе да таго, што яркасць зоркі вырасце, і яна спаліць паверхні найбліжэйшых да яе планет, уключаючы Зямлю.



«З касмічнага пункту гледжання ў нас ёсць як мінімум мільярд гадоў, пакуль Сонца не стане занадта магутнай крыніцай і без усякага антрапагеннага ўплыву на Зямлі пачнецца незваротны парніковы эфект», — паведаміў вядучы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага астранамічнага інстытута МДУ Сяргей Папоў.

Раней вучоныя з Манчэстэрскага ўніверсітэта змадэлявалі сцэнарый эвалюцыі Сонца. Па разліках даследчыкаў, праз 4-4,5 млрд гадоў свяціла распаліцца настолькі, што знішчыць усё жывое на Зямлі, а затым ператворыцца ў белага карліка, пакінуўшы пасля сябе планетарную туманнасць — масіўнае кольца міжзоркавага пылу і газу.

Нашы дзеці

# АСАБЛІВАЯ ЎВАГА Ў ЧАРОЎНЫЯ ДНІ

## Наталля Качанава наведала дзіцячы дом № 3 у Мінску

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА з цеплынёй паразмаўляла з дзецьмі, якія расказалі ёй аб сваіх патаемных жаданнях. Пасля навагодняга паказу, уручаючы салодкія падарункі, Наталля Качанава пажадала хлопчыкам і дзяўчынкам расці здаровымі, прыгожымі і разумнымі.**

У гутарцы з журналістамі яна сказала, што такія цудоўныя дзеці, а ў дзіцячым доме іх цяпер 65, павінны былі б адзначаць гэта свята з сем'ямі. Аднак жыццё распарадзілася інакш. Таты і матулі большасці выхаванцаў пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Цяпер аб іх клапоцяцца выхавальнікі. «Я ўдзячна людзям, якія працуюць у гэтым дзіцячым доме з малымі, аддаюць ім часцінку свайго сэрца, цяпла, любові. Таму што ўсе яны — нашы дзеці. І наша акцыя менавіта так і называецца», — падкрэсліла яна.

Наталля Качанава ўручыла дырэктару дзіцячага дома сертыфікат на набыццё абсталявання для кухні, а таксама сродкаў навучання. Падарунак для дзіцячага дома вельмі каштоўны. Прадукты харчавання для некаторых выхаванцаў па стане здароўя трэба спецыяльна апрацоўваць.


Фота БелТА.

Навагодняя дабрачынная акцыя «Нашы дзеці» стартавала ў Беларусі 10 снежня і прадоўжыцца па 11 студзеня. У Беларусі яна стала ўжо добрай традыцыяй. Наталля Качанава прызналася, што яе кожны раз перапаўняюць асаблівыя пачуцці. «Напярэдадні Новага года мы прыходзім у дзіцячыя дашкольныя ўстановы, школы, бачым усмешкі дзяцей, як яны радуюцца ў чаканні свята, сустрэчы з казачнымі героямі. Для кожнага дарослага гэта асаблівыя пачуцці», — дадала яна.

Галоўная мэта акцыі — не пакінуць без увагі ніводнае дзіця. Навагоднія святы, паказы і ранішнікі праходзяць ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Кіраўнікі дзяржорганаў і прадпрыемстваў, лідары грамадскіх аб'яднанняў наведваюць сацыяльна значныя аб'екты і віншуюць дзяцей, дораць ім камп'ютарную тэхніку, цацкі, спартыўны інвентар, ласункі. Асаблівая ўвага ўдзяляецца дзецям, якія апынуліся ў складанай жыццёвай сітуацыі, выхаванцам школ-інтэрнатаў.

**Паводле БелТА.**

# ЧАС ЦУДАЎ

**У рамках дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» госці з МУС наведалі падшэфную Радашковіцкую школу-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў.**

Хлопчыкаў і дзяўчынак павіншавалі **намеснік міністра ўнутраных спраў Аляксандр БАРСУКОЎ** і **начальнік Дэпартамента выканання пакаранняў МУС Алег МАТКІН.**

— Мы жадаем дзецям здароўя, поспехаў і дабрабыту, — сказаў Аляксандр Барсукоў. — Няхай усе непрыемнасці застануцца ў мінулым, а мы, дарослыя, будзем рабіць для гэтага ўсё магчымае. Мы разумеем, што для дзіцяці важна адчуваць любоў і клопат, і імкнёмся дапамагаць не толькі на святы — разам мы круглы год.



Выхаванцам інтэрната падарылі кнігі, мэблю, салодкія прысмакі. Таксама быў арганізаваны канцэрт. Перад прысутнымі выступілі салісты заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь «Ансамбля песні і танца ўнутраных войскаў МУС». Дзеці ў даўгу не засталіся і наладзілі гасцям тэатралізаваны паказ. Там былі і Дзед Мароз з унучкай, і пятачок Фунцік, і мех чароўных снежак. Вечар прайшоў па-сапраўднаму ярка, у цёплай, сардэчнай абстаноўцы.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

# НОВЫ ГОД БЕЗ ТУРБОТ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Штучная елка патрабуе на першы погляд менш клопату, чым натуральная. Вытрымліваць яе ў пад'ездзе не трэба, хвоя не асыплецца. Ды і купляецца яна не на адзін год. Здавалася б — варыянт шыкоўны. Але тут таксама ёсць свае нюансы. Ад занадта прывабных па кошце штучных прыгажунь лепш адмовіцца. Вельмі таннае наўрад ці бывае даволі якасным. Калі ад елкі ідзе нейкі хімічны пах — купляць яе таксама не трэба, паколькі гэтымі рэчывамі пасля будзеце дыхаць вы і вашы родныя. Якасная штучная елка не пахне ўвогуле нічым. Да дрэва да таго ж абавязкова мусіць прыкладацца спецыяльны сертыфікат, які пацвярджае яго гігіенічную бяспеку. Навагоднюю прыгажуню варта таксама кранучь за іголачкі. Яны не павінны неяк дэфармавацца або застацца ў руцэ. Таксама варта звяртаць увагу на матэрыял, з якога зроблена елка. Штучныя дрэвы з паперы з прамочваннем выглядаюць вельмі праўдападобна ў параўнанні са сваімі натуральнымі сабратамі, але наўрад ці праслужаць больш за тры гады. Таму калі вырашылі купляць пластыкавую елку, то лепш за ўсё прынесці дадому літое дрэва.

### Устаноўка па правілах

Першае і самае галоўнае — дрэва павінна быць надзейна замацавана. Ідэальна для гэтага падыдзе спецыяльная крыжавіна. Але калі елка невялікая, то падыдзе і спецыяльная кадка. Для штучнай елкі найлепшы варыянт — адмысловыя металічныя падстаўкі. Яны больш трывалыя і ўстойлівыя.

— Інтэрнэт поўніцца відэа пра тое, як навагоднюю ёлку пераварочваюць каты, якія вырашылі пагуляцца з упрыгожаннямі, — зазначае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Прыцягвае яна ўвагу і дзяцей. Праўда, у такім выпадку трэба ўлічваць і тое,



адкуль падае асвятленне, і адлегласць ад дзіцячага ложка, каб у дзеянне не ўмяшаўся псіхалагічны фактар — уначы даволі аб'ёмны сілуэт елкі можа напалохаць малога, падаўшыся персанажам з фільма жахаў... Таму найлепшым месцам для елкі будзе кутоk, размешчаны як мага далей ад прахода, батарэй ацяплення і электрычных прыбораў. Вось там яна ўжо дакладна нікому не перашкодзіць. І нават калі елку выпадкова крануць дзеці падчас гульняў, то яна не ўпадзе і нікому не нанясе траўму. А вось падсвечнікі са свечкамі лепш прыбраць далей — усётакі гэта адкрытая крыніца агню. Таксама адмоўцеся ад светлавых эфектаў, падчас якіх выкарыстоўваюцца хімічныя рэчывы, бенгальскія агні і хлапушкі. Яны таксама небяспечныя для елкі.

### Тэст для гірлянды

Пры выбары электрычнай стужкі таксама варта звярнуць увагу на шэраг уласцівасцяў. Усё ж такі гэта — электрапрыбор, які да таго ж пастаянна знаходзіцца на патэнцыяльна небяспечным прадмеце.

— Гірлянда павінна быць сертыфікаваная, — раіць Анастасія Швайбовіч. — Гэта будзе азначаць, што яе тэсціравалі ў спецыяльна абсталяванай лабараторыі. У якасна зробленага тавару ізаляцыя правадоў шчыльная, гнуткая і не мае знешніх пашкоджанняў. Лямпачкі — выключна закрытага тыпу. Звярніце ўвагу на каробку пераключальніка рэжымаў. Калі яна гнецца, то выберыце іншую гірлянду. Папрасіце прадаўца ўключыць яе. Такім чынам вы ўбачыце, наколькі добра яна працуе. Лямпачак, якія не загараюцца, там быць не павінна — гэта яскравы сігнал аб тым, што гірлянда няспраўная. Таксама праверце тры асаблівыя рызыкоўныя месцы. Гэта злучэнні праводу з вілкай і пераключальнікам рэжымаў, а таксама лямпачкамі. Занадта тонкія правады могуць вельмі лёгка парвацца або загарэцца ад перагрэву. Таксама не рэкамендуецца ўключаць адначасова ў адну разетку некалькі гірлянд. Упрыгожваючы ёлку, не апускайце гірлянды вельмі блізка да падлогі, дзе іх могуць выпадкова зачапіць дзеці або хатнія гадаванцы. У такім выпадку гірлянда перакуліць ёлку з навагоднімі цацкамі ды упрыгажэннямі і ўдарыць токам. Зіхатлівую стужку выключайце, калі ідзяце спаць або сыходзіце з дому.

Але што ж рабіць, калі, нягледзячы на ўсё, елка загарэлася? Ратавальнікі раяць, што перш за ўсё трэба абясточыць электрычную гірлянду і толькі пасля гэтага прыступаць да тушэння. Для гэтага дрэва неабходна паваліць на падлогу і заблакаваць доступ да яго кіслароду шчыльнай тканінай, а пасля скарыстацца вогнетушыцелем або вадой. Праўда, з дапамогай вады штучную елку тушыць нельга — палімерныя матэрыялы ад агню плавяцца і расцякаюцца па падлозе. Калі туды трапяць кроплі вады, то гэта толькі павялічыць плошчу гарэння. Таксама трэба памятаць пра тое, што сінтэтыка падчас гарэння выдзяляе ў паветра вельмі шмат шкодных рэчываў. Таму калі за першыя хвіліны перамагчы полымя не ўдалося, то адзінае, што застаецца, — пакінуць пакой і выклікаць пажарных.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ШТО РАСКАЗАЎ ДЗЕД МАРОЗ

**У канцы снежня, калі каляндарны год падыходзіць да канца, усе справы, якія турбуюць людзей штодзень, адыходзяць на задні план. У гэты час і стары, і малы жывуць у прадчуванні цуду. І хто як не Дзед Мароз у стане ажыццявіць самыя смелыя мары? Перадвнавагодні час — гарачая пара для нашага галоўнага Дзеда Мароза з Белавежскай пушчы, але ён знайшоў гадзіну, каб прыехаць у Мінск, пагутарыць з журналістамі, адказаць на пытанні і павіншаваць чытачоў з надыходзячымі святамі.**




Шмат цікавага з жыцця Дзеда Мароза стала вядома ў гэты дзень. Так, напрыклад, любімая страва дзядулі — беларускія дранікі, а сярод найлепшых сяброў — фінскі Ёўлупукі і рускі сабрат з Вялікага Усцюга. Расказаў Дзед Мароз і аб сваіх жыцці і працы. Так, напярэдадні навагодніх свят, у рэзідэнцыю да Дзеда Мароза ў Белавежскую пушчу штодзень прыязджае каля 6-7 тысяч гасцей. Што за зімні час складае каля 100 тысяч ахвотных пабачыць галоўнага зімовага чараўніка. Сярод турыстаў не толькі беларусы, але і выхадцы з замежжа. На рахунку ў Дзеда Мароза госці са 101 краіны свету. Сярод турыстаў шмат выхадцаў з экзатычных краін: так, сотай у спісе значыцца Буркіна-Фасо, а сто першай — М'янма. Але людзі не толькі прыязджаюць у госці на зімовыя святы да Дзеда Мароза, але і пішуць лісты штогод. Амаль 17 тысяч лістоў з розных краін свету атрымаў Дзед Мароз сёлета, сярод іх ёсць нават карэспандэнцыя з Кітая і Японіі.

Каб надыходзячы год быў напоўнены толькі добрымі момантамі, дзядуля параіў сустрэць яго ў сямейным коле, і чым болей родзічаў збярэцца вакол навагодняга стала, тым лепей будуць ісці справы ў наступным годзе.

**Андрэй САЗОНАЎ, фота аўтара.**

Тэатр

# ЗА ЗАСЛОНАЙ ПРЭМІІ

## Пяць секцый журы вызначалі найлепшыя спектаклі з 48, што разглядаліся ў фінале

**Сярод тэатраў, якія атрымалі ўзнагароды Нацыянальнай тэатральнай прэміі ў розных намінацыях, пастаноўкі не толькі з Мінска, але і з Гомеля, Магілёва, Бабруйска, Маладзечна, Брэста... І сапраўды, якасных спектакляў вартыя гледачы розных рэгіёнаў. Аднак вызначаць найлепшае ў тэатры — задача ўсё ж не для гледача, пра што ахвотна жартавалі вядучыя цырымоніі акцёры-купалаўцы Валянціна Гарцуева, Марта Голубева і Павел Харланчук. Яны здолелі надаць імпрэзе святочны характар і адначасова падкрэсліць умоўнасць канкурэнцыі. Аднак тэатральная прэмія — гэта магчымасць стымуляваць тэатральны працэс. Вядома, калі яе атрымліваюць найлепшыя. Паводле журы (у кожнай з секцый быў свой склад прафесіяналаў) у якасці найлепшых вызначаны наступныя пастаноўкі:**

1. **«Багема»** Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра Беларусі — найлепшы оперны спектакль V Рэспубліканскага конкурсу тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія». За выкананне партыі Марсэля ў гэтай оперы ўзнагароджаны спявак Уладзімір Громаў (найлепшая мужчынская роля ў музычным тэатры).

Аднак за сцэнаграфію адзначана іншая пастаноўка Вялікага і мастак-пастаноўшчык Аляксандр Касцючэнка (за работу над операй «Тоска»). Сярод лаўрэатаў Нацыянальнай тэатральнай прэміі таксама балерына Ірына Яромкіна як «выканаўца найлепшай жаночай ролі ў музычным спектаклі» (у балеце «Каханне і смерць» Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі). Але...

2. Найлепшай балетнай пастаноўкай стаў **«Вішнёвы сад»** Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра, адзначана і праца ў ім маладога балетмайстара Сяргея Мікеля — як найлепшага пастаноўшчыка музычнага спектакля.

3. Яшчэ адзін музычны спектакль чакана звярнуў на сябе ўвагу журы: незвычайны для нас мюзікл **«Недалёка ад нормы»** Б. Ёркі (тэатра «Тэрыторыя мюзікла»). Пастаноўку Настассі Грыненкі адзначылі як «Найлепшы спектакль у жанры аперэты, музычнай камедыі, мюзікла». Такое рашэнні журы ў секцыі музычнага тэатра выклікае павагу.

4. Журы ў секцыі тэатра лялек уразіла неверагоднай прынцыповасцю і прызнаннем: у гэтым кірунку шмат што мяняецца, і традыцыйныя падыходы да вызначэння найлепшых наогул некарэктныя. Як вызначыць найлепшага выканаўцу ролі, калі аднаго персанажа часам «ажыўляе» цэлая каманда і наадварот, усе лялечныя ролі ў спектаклі можа весці адзін артыст. Але што адмяніць немагчыма — уражанне, якое пакідае пастаноўка ці сцэнаграфія ў ёй. Напрыклад, створаная Таццянай Нерсісян для спектакля «Новая зямля» Брэсцкага тэатра лялек (прэмія за найлепшую работу мастака-сцэнографа). Ці ўражанне ад спектакля, калі ў ім ёсць рэжысёр, здольны ствараць мастацтва, напрыклад такі, як Юра Дзівакоў, які атрымаў прэмію як пастаноўшчык спектакля «Пліх і Плюх» Гомельскага дзяржаўнага тэатра лялек. Пры гэтым найлепшым спектаклем для дзяцей і юнацтва паводле журы ў гэтай намінацыі стаў таксама лялечны спектакль — **«Калядная гісторыя»** Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек у пастаноўцы Ігара Казакова.

5. Але рэальны трыумф чакаў сёлета рэжысёра Яўгена Карняга: найлепшым спектаклем тэатра лялек стала пастаноўка **«Сёстры Грай»** Мінскага абласнога тэатра лялек «Батлейка» (г. Маладзечна).

6. Найлепшым эксперыментальным спектаклем прызналі яшчэ адну пастаноўку Яўгена Карняга — пластычна-паэтычны **«Бетон»** Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі.

7. Аднак гэты тэатр нават не фігураваў сярод намінантаў у кірунку беларускай драматургіі. Нацыянальная тэатральная прэмія за найлепшую пастаноўку паводле твора беларускага аўтара адзначылі спектакль **«Кропкі на часавай восі»** паводле Дзмітрыя Багаслаўскага Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя Дуніна-Марцінкевіча (Бабруйск). Рэжысёрам выступіла Таццяна Траяновіч, кіраўнік Цэнтра эксперыментальнай рэжысуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. І менавіта гэты спектакль, як ні дзіўна, звярнуў на сябе ўвагу журы, якое вызначала перамогу ў намінацыі «найлепшая работа сцэнографа ў тэатры драмы»: ўзнагароду атрымала Валянціна Праўдзіна.

8. У катэгорыі драматычнага тэатра здзіўленняў было найбольш. Самым лепшым спектаклем тэатра драмы малой формы назвалі **«Метад»** (рэжысёр-пастаноўшчык Віталь Краўчанка) Гомельскага гарадскога маладзёжнага тэатра, які абышоў шэраг гучных пастановак. У адной з іх усё ж разглядзелі выканаўцу «найлепшай жаночай ролі ў спектаклі тэатра драмы» — Юліяну Міхневіч («Опіум» Цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «АРТ Карпарэйшн»). Актрыса, дарэчы, апярэдзіла Святлану Анікей, якая была намінаваная адразу за выкананне васьмі жаночых роляў у спектаклі купалаўцаў «Радзіва Прудок».

9. Але купалаўцы сёлета сярод фаварытаў. Найлепшы драматычны спектакль — **«Рэвізор»** Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, а пастаноўшчык спектакля Мікалай Пінігін адзначаны ў намінацыі «Найлепшая работа рэжысёра ў тэатры драмы». Адзначана і работа народнага артыста Беларусі Віктара Манаева — як найлепшага выканаўцы мужчынскай ролі (Гараднічага).

10. Магілёўскі абласны драматычны тэатр сёлета таксама быў у намінацыях з некалькімі пастаноўкамі. У выніку Нацыянальную тэатральную прэмію за ўнёсак у развіццё тэатральнага мастацтва Беларусі атрымаў дырэктар Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра **Андрэй Новікаў**.

Пяты па ліку рэспубліканскі конкурс «Нацыянальная тэатральная прэмія» набыў намінацыі, якія адкрываюць магчымасці вылучыць новыя павевы ў тэатральным руху, у тым ліку і жаданне тэатра быць пляцоўкай для дыялогу па тэмах, што хвалююць сёння. Аднак ці падштурхнуць вынікі конкурсу да развіцця гэтай тэндэнцыі? Пакажуць афішы...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

Сугучча

# «Маладая гвардыя» шукае беларускіх аўтараў

**Найстарэйшае на постсавецкай прасторы выдавецтва «Маладая гвардыя» рыхтуецца ўзяць удзел у XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, якая пройдзе 28 лютага — 4 сакавіка 2019 года. Да гэтага часу, расказалі расійскія кніжнікі, планецца падпісаць прамую дамову з «Белкнігай» — а значыць, прапанаваць пакупнікам кнігі выдавецтва ў больш шырокім асартыменце і па прымальнай цане.**



Фота Андрэя САЗОНАВА.

«Да гэтага часу мы вымушаныя былі працаваць з пасрэднікамі, што істотна падвышала цэны — спадзяёмся, што пасля заключэння дамовы яны зменшацца прыкладна ў два разы», — адзначыў **выканаўчы дырэктар выдавецтва «Маладая гвардыя» Раман КАСЫГІН.**

Па традыцыі акрамя ўласна кніг на выстаўку прыедуць аўтары, якія трывала і плённа супрацоўнічаюць з выдавецтвам, а таксама і некаторыя героі — так, у апошнія некалькі гадоў тут крыху «мадэрнізавалі» свой галоўны рарытэт, вядомую біяграфічную серыю «ЖЗЛ» (Жыццё знакамітых людзей) і з 2005 года пачалі выдаваць кнігі пра нашых сучаснікаў з назвай «Біяграфія працягваецца».

Цікавым трэндам стала і выданне біяграфічных зборнікаў — паколькі асоб «першага раду», якім можна прысвяціць асобнае грунтоўнае даследаванне, не так шмат, а расказ пра герояў, якія мелі дачыненне да важных гістарычных падзей, дапамагае глыбей зразумець кантэкст гэтых падзей. Канонам і ўзорам кніг падобнага кшталту ў «Маладой гвардыі» называюць работу беларускага аўтара — тэле- і радыёвядучага, гісторыка, сцэнарыста, журналіста Вячаслава Бандарэнкі, зборнік «Героі Першай сусветнай». Сам аўтар прызнаецца, што на збор фактаў для кнігі спатрэбілася амаль сем гадоў, затое вынік пераўзышоў усе чаканні — кніга атрымала Усерасійскую гісторыка-літаратурную прэмію «Аляксандр Неўскі», прычым упершыню гэта ўзнагарода была прысуджана нерасійскаму пісьменніку. Сёлета ж «Маладая гвардыя» выдала новую работу нашага суайчынніка — кнігу серыі «ЖЗЛ», якая расказвае пра «духоўніка ўсяе Русі», чыё імя вядомае на ўвесь хрысціянскі свет, айца Іаана Крэсцьянкіна. У студзені 2019-га, дарэчы, выйдзе ўжо другое выданне гэтай кнігі, з правам рэалізацыі ў кнігарнях пры храмах і манастырах.

Дарэчы, прадстаўнікі выдавецтва шчыра расказалі: яшчэ адна з задач цяперашняй паездкі ў Беларусь — пошук новых аўтараў. «Мы адкрытыя да супрацоўніцтва, і вельмі зацікаўленыя ў тым, каб у серыі «ЖЗЛ» расказвалася і пра беларускіх дзеячаў — канешне, вельмі цікавая постаць Машэрава, расказ пра беларусаў — герояў Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку Сталінградскай бітвы, біяграфіі іншых выдатных асоб. І на наш погляд, лепш, каб кнігі на беларускія тэмы пісалі людзі, якія жывуць тут, глыбока ведаюць і любяць гэту зямлю, яе гісторыю», — гаворыць **першы намеснік дырэктара выдавецтва Уладзіслаў БАДЗЯКІН**. Таму «маладагвардзейцы» сустрэліся ў Мінску не толькі з журналістамі, але таксама з чытачамі і літаратарамі, якія маглі б узяцца за пэўныя беларускія тэмы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**❍ Дарэчы**

**Серыя ЖЗЛ, кнігі якой лёгка пазнаць па адметных шэрых пераплётах з вывявай белага факела, была заснаваная яшчэ ў 1890 годзе, а «Маладая гвардыя» працягнула яе з 1938-га.**

# «ПАРТЫЗАНСКАЯ ЁЛКА»

**Свята з такой назвай правялі 23 снежня ў Віцебскім абласным музеі Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова, чым вельмі парадавалі наведвальнікаў у дзень нараджэння легендарнага бацькі Мінная. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху Беларусі нарадзіўся ў 1891 годзе ў вёсцы Пунішча Веліжскага павета Віцебскай губерні.**



У прыватнасці, у музеі прэзентавалі вельмі цікавую выстаўку, прысвечаную... сапёрнай рыдлёўцы. Калекцыянер Генадзь Дубінін расказаў пра гісторыю стварэння «таго, што салдат ніколі не кіне». Бо ёй можна не толькі капаць. Рыдлёўку, напрыклад, эфектыўна выкарыстоўваюць пры рукапашным баі. Пра гэта, між іншым, згадвалі немцы, калі апісвалі майстэрства рускіх салдат. Рыдлёўку яшчэ і кідаюць у праціўніка. Яна ж, калі насіць пад рэменем, абараняе ад асколкаў. Яшчэ на ёй можна сядзець, калі зямля вільготная. І нават ежу падсмажыць...

Дарэчы, саму канструкцыю за ўсе гады практычна не змянілі. А вынаходнік гэтага армейскага «аксесуара» — дацкі афіцэр Мадс Лінэман. Рыдлёўка была запатэнтавана ім у 1870 годзе. Цікава, што да гэтага ён прапаноўваў забяспечваць асабовы склад пяхоты ўніверсальным інструментам, які адначасова ўяўляў сабой рыдлёўку, пілу, нож і патэльню. Але ваеннае ведамства Даніі прыняло на забеспячэнне спрошчаную версію.



Былы выкладчык гісторыі Генадзь Дубінін мае ў сваёй калекцыі і рарытэты. Адказваючы на пытанні карэспандэнта «Звязды», адзначыў, што цікавы экспанат можна купіць не толькі на інтэрнэт-аўкцыёнах, а і на рынку...

Гасцей «Партызанскай ёлкі» традыцыйна частавалі гарбатай і сушкамі ў зямлянцы — копіі тых, у якіх жылі партызаны.

**Дырэктар Віцебскага абласнога музея Ірына ШЫШКОВА** адзначыла, што розныя крэатыўныя мерапрыемствы будуць праводзіцца і надалей.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

Год малой радзімы

# «Каб мы не забывалі адзін аднаго»

## Краязнаўчым сустрэчам — быць!

**КРАЯЗНАЎСТВА — справа апантаных. Ім займаюцца тыя, хто насамрэч любіць сваю родную мясцовасць і гатовы ўкласці сілы і час у тое, каб лепш зразумець, адчуць, даведацца, што ўяўляе сабой аб'ект гэтай любові. «Краязнаўчая прэзентацыя першага Года малой радзімы», якая гэтымі днямі прайшла ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, сабрала разам такіх неабыякавых людзей, з іскрынкай у вачах, з сапраўдным агнём даследчыка ў душы. Адметна і тое, што гэты год — толькі першы. Следам за ім будзе яшчэ два гады, афіцыйна прысвечаныя малой радзіме.**

— Без чалавека, без апантанай асобы, якая займаецца краязнаўствам, яно не было б на такім узроўні, як сёння, — мяркуе адзін з вядучых краязнаўчай прэзентацыі, **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ**. — Шкада, што выдатныя вынікі такой працы не ўсе разумеюць і бачаць. Выдатна і тое, што кожны з нас лічыць сваю малую радзіму самай прыгожай... Дзякуй усім, хто вывучае родную мясцовасць, папулярызуе веды пра яе, і тым самым робіць нашу краіну яшчэ лепшай.

Прысутныя не толькі падводзілі вынікі года, які прайшоў. Многае ўжо цяпер планавалася наперад. Так **старшыня «Беларускага фонду культуры» Тадэвуш СТРУЖЭЦКІ** падзяліўся сваімі планамі:

— Краязнаўцы адкрываюць для нас многія маловядомыя рэчы, выклікаюць сапраўднае захапленне. А далей усё залежыць ад кожнага чалавека — як далёка мы пойдзем у далейшым вывучэнні, ці наведаем месца. Будзем уносіць прапановы аб правядзенні ў наступным годзе Рэспубліканскай краязнаўчай канферэнцыі. Мы да гэтага гатовы, ёсць дастаткова зацікаўленых людзей, можна падрыхтаваць дзясяткі цікавых дакладаў — і зрабіць гэта публічна, шырока. А на канферэнцыі яшчэ раз вярнуцца да даўняй ідэі Рэспубліканскага краязнаўчага таварыства. Ёсць і іншыя думкі, якія варта было б зноў агучыць — гэта аднаўленне і працяг унікальнага навукова-даследчага выдавецкага праекта «Памяць». Дзякуючы яму былі напісаны гістарычныя даведнікі аб усіх раёнах нашай краіны. Але сёння, мы ўпэўнены, застаецца яшчэ шмат белых плямаў, якія выявіліся дзякуючы краязнаўчай дзейнасці. Ёсць шмат новых цікавых гістарычных фактаў, якія патрабуюць асэнсавання і, самае галоўнае, захавання для гісторыі. Таксама мяркую, што ў Нацыянальнай бібліятэцы трэба зрабіць паўнавартасны фонд краязнаўчай літаратуры. Бо толькі тое, што захоўваецца ў фондах бібліятэкі, — толькі частка таго, што выдалі краязнаўцы. А іх кнігі насамрэч з'яўляюцца вельмі карыснымі для даследчыкаў і навукоўцаў. Праз стварэнне такога фонду будзе фарміравацца больш поўная палітра краязнаўчай дзейнасці ў нашай краіне. Хачу звярнуць


Фота Кастуся ДРОБАВА.

увагу, што нам трэба вельмі ашчадна ставіцца да тых вёсак, сяліб, якія знікаюць. Бо сапраўды многія з іх зносяцца бульдозерамі. А разам з імі прападаюць і унікальныя экспанаты, якія з'яўляюцца незваротнымі. Здавалася б, самая лепшая крыніца для фарміравання фондаў краязнаўчых музеяў — гэта даследаванне такіх будынкаў, якія разбураюцца і не маюць гаспадароў — гэта трэба даказваць і ў сябе на месцах, і на ўзроўні рэспублікі. Наша гісторыя нашмат больш багатая, чым мы сёння ўяўляем.

Краязнаўства, памяць пра сваю малую радзіму — яно і ў гаворках, агульных успамінах блізкіх людзей ці цяпер ужо проста знаёмых. Памяць ажывае, калі ёсць той, хто памятае. Пра гэта расказаў **галоўны рэдактар «Краязнаўчай газеты» Уладзімір ГІЛЕП**:

— Мы, магчыма, забылі тыя фэсты, якія раней былі ў кожнай вёсцы. На маёй малой радзіме ў Капыльскім раёне таксама ладзіліся такі фэст. Гэта быў дзень 12 верасня, калі ў вёску з'язджаліся ўсе родзічы. Пазней такія зборы забаранілі. Сёння трэба аднавіць гэтую традыцыю, вярнуцца да сходкі людзей, каб мы не забывалі адзін аднаго. Я раз на год бываю ў роднай вёсцы: у такія моманты адчуваеш, як людзі хочуць цябе бачыць, і ты іх хочаш бачыць. Нешта мы пачалі забываць гэту векавечную традыцыю беларусаў — пэўна, XXI стагоддзе накладае свой адбітак. Варта адзначыць, што кожны сельсавет павінен думаць пра тое, што, калі на месцы вёскі і пройдзе бульдозер, там павінен стаяць камень, на якім будуць напісаны прозвішчы людзей гэтай вёскі. Я сваю радню з пачатку XVIII стагоддзя ведаю. А прозвішчы жыхароў сваёй вёскі ведаю ўсе — яны захаваліся да сённяшняга дня. Нашы з вамі прозвішчы — гэта самы цікавы помнік для гісторыі.

У Год малой радзімы трэба паглыбляцца ў такія тэмы.

Цікавы промысел на сваёй Бацькаўшчыне апантана адраджае **Іван ВОСІПАЎ**. Ён нават агр속асдзібе даў адпаведную арыгінальную назву — «Братэрства босых бортнікаў»...

— Дваццаць гадоў я займаюся вывучэннем не толькі тэмы бортніцтва, але і сваёй роднай вёскі, — кажа Восіпаў. — Таксама я вылучыў для сябе такі кірунак, як вывучэнне лакальнай культуры — гэта ўсё тое, што датычыцца самой вёскі, яе адносін з іншымі рэгіёнамі. За гэты час было назбірана шмат матэрыялу. Пакуль я пішу адну кнігу: ужо назбіраны звесткі пра тую нематэрыяльную спадчыну, якая існавала раней, існуе зараз, захоўваецца носьбітамі... У дзяцінстве я жыў і працаваў у вёсцы з бабуляй і дзядулем — і кароў пасвіў, і сена зграбаў, і шмат іншага рабіў. Таму вырашыў сабраць звесткі пра вясковы лад — для тых, хто жыў там раней, цяпер жыве ці будзе жыць! І данесці свой пасыл калі не да ўсіх, то да тых, хто звязаны з гэтым месцам. Зараз я раблю кнігу, у якой апісаў метады здабычы рыбы, мясціны, дзе можна гэта зрабіць, прылады, якімі можна карыстацца. Я займаўся гэтым разам з дзедам і бацькам, калі быў малы, — для традыцыйнай вёскі звычайная справа. Аднак акрамя краязнаўча-этнаграфічнай працы я ўжо 12 гадоў вывучаю і папулярызую дагэтуль мала вядомы промысел бортніцтва. Гэта форма пчалярства, а таксама людзі, якія ім займаюцца, асяроддзе. Гэты высакародны промысел захаваўся дзякуючы выходам мясцовага чалавека да сваёй справы, бо бортніцтва немагчыма перанесці ў іншы рэгіён. Гэты промысел звязвае чалавека са сваім асяроддзем і краем. Бортнікі ведаюць усё — дзе расце пэўная расліна, дзе жыў той ці іншы звер, дзе ён прабягаў. Таксама трэба ведаць і адчуваць паводзіны кожнай істоты. І таксама разумець з'явы прыроды, якія з'яўляюцца становічымі ці адмоўнымі для гэтага промыслу: калі яны адбываюцца — што прыносяць з сабой. Натуральна, што папулярызацыя такіх спецыфічных промыслаў — даволі складаная справа, хоць і цікавая.

Яшчэ шмат надзвычай цікавых дакладаў гучала на краязнаўчай прэзентацыі. Аднак хіба змесціш іх усе ў адным артыкуле? Кожны раён багаты, асаблівы па-свойму. Калі мы будзем глядзець на свет раскрытымі вачыма, пабачым яшчэ шмат чаго цікавага.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**

Пантэон Айчыны

# Спірыдон Собаль

*(? — каля 1645)*

**Ён усё жыццё нёс людзям асвету. Сам сябе Спірыдон Собаль называў «друкаром пісанняў боскіх». Друкаваў ён кнігі, навучаў дзетак і бачыў у гэтым сваё пакліканне.**

Сын магілёўскага бурмістра Багдана Собаля быў актыўным сябрам Магілёўскага праваслаўнага брацтва. Ён валодаў грэчаскай, лацінскай і нямецкай мовамі, меў вялікія веды і шчодра дзяліўся імі. Быў «рэктором школы Могилевское». Вучыў ён — вучыўся і сам. Школа дала Спірыдону Собалю багаты досвед настаўніцтва, і ён выпрацаваў сваю метадыку навучання дзяцей грамаце, што, зрэшты, і спатрэбілася яму ў асветніцкай дзейнасці.

Пасля 1624 года Собаль пераехаў у Кіеў, дзе таксама ўзначаліў школку праваслаўнага брацтва. Аднак Спірыдону хацелася большага — друкавання «писаний божественных». Собаль заснаваў друкарню, у якой у 1628 годзе і выдаў сваю першую кнігу «Лімінар, сірэч кветнік» візантыйскага пісьменніка Яна Мосха. Гэта быў зборнік маральна-павучальных апавяданняў, перакладзены на царкоўнаславянскую мову.

За два гады працы ў сваёй кіеўскай друкарні Собаль выдаў яшчэ некалькі кніг, сярод якіх і «Апостал». У 1630 годзе Спірыдон Собаль па запрашэнні мсціслаўскага каштэляна Багдана Статкевіча ўзначаліў друкарню ў Куцеінскім манастыры каля Оршы. Работа ў Куцеінскай друкарні была плённай. Адна за адной выходзілі кнігі: «Псалтыр» (пад назвай «Брашна духоўнае»), «Буквар», «Малітвы паўсядзённыя» (1631 год), «Часаслоў» (1632 год). Пэўна, галоўнай для сябе кнігай



Собаль лічыў «Буквар», у якім ён выкарыстаў сваю методыку «учения детям начинающим чтению» — простую для аваладання граматай. Метадыку Собаля выкарыстаў маскоўскі друкар Васіль Бурцаў, які ўслед за беларускім асветнікам назваў сваю граматыку «Букваром». Так гэтая назва з цягам часу замацавалася за падручнікамі па граматыцы. Такім чынам, Спірыдон Собаль як бы стаў «хросным бацькам» буквара.

Для беларускага асветніка важна было і выхаванне дзяцей у хрысціянскім духу, таму ў «Буквар» ён уключыў найважнейшыя палажэнні хрысціянскай веры і малітвы.

Спірыдон Собаль добра разумеў значэнне друкарскага станка для пашырэння асветы і адукацыі народа. Друкар жадаў пашыраць друкарню і выдаваць шмат «знаметных книг». Аднак з-за недахопу сродкаў ён мусіў перавыдаваць свае ранейшыя кнігі. У 1635 годзе Собаль заснаваў друкарню ў Буйнічах, дзе выдаў «Псалтыр». А пасля перабраўся ў родны Магілёў. Тут у 1636 годзе Собаль перавыдаў свой «Буквар языка словеньска», значна перапрацаваны і ўдасканалены «Псалтыр» (1637 год) і «Тастамент» (1638 год). Гэта былі апошнія выдадзеныя Спірыдонам Собалем кнігі.

Нешта не заладзілася ў Собаля ў Магілёве, і ён вырашыў перанесці сваю дзейнасць у Маскву. Як яму здавалася, там ён мог зрабіць шмат. У 1637 годзе Спірыдон Собаль разам з магілёўскімі купцамі пабываў у Маскве. Ён сустрэўся з маскоўскім друкаром Васілём Бурцавым. Той не толькі прызнаў высокае майстэрства беларускага друкара, але і набыў у яго друкарскія прылады. Акрыленьі надзеямі на лепшае, Спірыдон Собаль вярнуўся ў Магілёў, распрадаў сваю маёмасць і адправіўся ў Маскву. Навучаць «словалитному делу» маскоўскіх друкароў, скласці такія патрэбныя слоўнікі лацінскай, нямецкай і грэчаскай моў. Як гэта часта бывае — шчырыя памкненні падзвіжніка разбіваюцца аб глухую сцяну абыякавасці, а то і звычайнай боязі новага... Так здарылася і з Собалем. Друкара затрымалі ў Вязьме для вырашэння яго лёсу. Цару Міхаілу Фёдаравічу паведамілі аб жаданні магілёўскага друкара перакладаць на рускую мову «богоносныя» кнігі і навучаць дзяцей грэчаскай, лацінскай і польскай «писмени». Ды і сам Собаль пісаў цару чалабітную з просьбай дазволу «издавати и прочая книги божественныя, душеполезныя и языка научити ся или толмачити». Спірыдон Собаль прапаноўваў цэлую асветніцкую праграму: кнігадрукаванне, пераклад кніг, стварэнне школы для навучання дзяцей замежным мовам. Разам з Собалем ехалі і «паспешнікі»-паплечнікі яго асветніцкай дзейнасці. Можна ўявіць маштабы дзейнасці Собаля: у спрыяльных умовах ён мог стварыць сапраўдны культурна-асветніцкі цэнтр у Маскве.

Нарэшце ў Вязьму прыйшоў загад: «Государь указал того могилевца Спиридона Собаля из Вязьмы отпустить назад у Литву, а в Москву его отпущать не велел, что в его ученья и в книгах смуты не было... и от него б, Спиридона, какая ересь не объявилась». Са скрухай Спірыдон прызнаўся: «О сих ответу не прием, по смотрению Божию, нужди настоящаго дела моего печатного возвратихся к себе». Расчараванне было такое вялікае, што Собаль сыходзіць ад свецкай мітусні ў Кіева-Пячэрскі манастыр і прымае манаства.

Славу асветніка неслі па свеце яго выданні. З далёкай Валахіі ў 1645 годзе да былога друкара прыйшло запрашэнне друкаваць там кнігі. Зноў можна было жыць сваім пакліканнем. Немалады ўжо Собаль сабраўся ў дарогу. Толькі дарога была апошняй. У канцы таго ж 1645 года Спірыдон Собаль «печатник писаний божественных» памёр.

Шкада апантаных людзей, якія не змаглі ажыццявіць напоўніцу свае добрыя і патрэбныя намеры. Гэта не загублены талент — гэта згублены ў часе талент, які абавязкова адкрыюць іншыя. Калі талент і маленькі — ён камусьці спатрэбіцца. А на «Букварах» Спірыдона Собаля ўзгадвалася некалькі пакаленняў, і паводле яго методыкі навучаюць граматыцы і цяпер. Дык, што ні кажы, усё ж увасобіў ён свой талент высока і годна.

**Вітаўт ЧАРОПКА.**

# ХВАРОБЫ, ЯКІЯ ВАРТА ЛЯЧЫЦЬ, А НЕ САРОМЕЦЦА ІХ

**Любыя жыццёвыя непаладкі мы жартам называем «гемароем», а вось тым, хто сутыкнуўся з такой праблемай, жартаваць зусім не хочацца. Пра памылковыя погляды на гэту хваробу, пра тое, ці абавязкова яе аперыраваць, а таксама аб тым, калі трэба пачынаць абследавацца на каларэктальны рак і чаму пасля навагодніх свят так шмат абвастрэнняў практалагічных хвароб, расказаў кандыдат медыцынскіх навук, урач-практолаг вышэйшай катэгорыі медыцынскага цэнтра «Ладэ» Дзмітрый ГРАБЕННІКАЎ.**

## Непатрэбны гемарой

***— Дзмітрый Сяргеевіч, з якімі захворваннямі найчасцей звяртаюцца пацыенты?***

— Найперш гемарой — вострыя і хранічныя формы. Даволі частая з'ява — анальныя трэшчыны. Нярэдка звяртаюцца цяжарныя жанчыны — таксама з гемароем і запорамі. Распаўсюджаны і парушэнні маторыкі кішэчніка — або запоры, або сіндром раздражнёнага кішэчніка.

***— Якія асноўныя сімптомы гемарою? Што павінна насцярожваць?***

— Як правіла, гэта наяўнасць крыві і розных утварэнняў у заднім праходзе. Праўда, такія сімптомы не заўсёды ўказваюць на гемарой. Гэта можа быць парапрактыт, паліпы, пухліны прамой кішкі, так могуць праяўляць сябе неспецыфічныя язвавыя каліты, хвароба Крона, тыя ж анальныя трэшчыны. Пацыент думае, што ў яго гемарой, і лечыцца свечкамі, а ў яго на самай справе іншае захворванне. Таму лепш звярнуцца да спецыяліста. Ёсць і іншая крайнасць: часам палохаюць, што калі не лячыць гемарой, будзе рак. Гэта не так, гемарой не пераараджаецца ў рак.

***— Хворага зразумець можна — з такімі праблемамі людзі нярэдка саромеюцца ісці да ўрача...***

— І з-за беспадстаўнай сарамлівасці часта ўпускаюць магчымасць на ранніх стадыях выявіць хваробу і справіцца з ёй. Той жа гемарой можна вылечыць вельмі проста. На 1-й ступені ён лечыцца кансерватыўна — з дапамогай свечак і нармалізацыі харчавання. Вены прыходзяць у тонус і вяртаюцца ў нармальнае становішча.

***— Што, дарэчы, уплывае на развіццё гэтых практалагічных хвароб? Наш лад жыцця — няправільнае харчаванне, сядзячая работа?***

— Часцей за ўсё хваробы ўзнікаюць з-за парушэння акта дэфекацыі, калі з'яўляюцца запоры. Чалавек пачынае напружвацца. У норме гэта павінна рабіць прамая кішка, самастойна скарачаючыся. Калі мы мала ўжываем вадкасці і клятчаткі, калавыя масы сухія і цвёрдыя. На другім месцы сярод прычын — сядзячая работа. Калі мы доўга сядзім, адбываецца перапаўненне органаў малога таза крывёй, парушаецца яе адток, пачынаюць расцягвацца і вены, і звязкі — узнікае гемарой. Трэцяя прычына — падняцце цяжару і цяжкі спорт. Рэзкі прыток крыві, якая не паспявае адцякаць назад, — часта так узнікаюць у тым ліку і трамбозы гемараідальных вузлоў. Яшчэ адна важная прычына — нервовы стрэс. Наша прамая кішка звязана з пачуццём бяспекі, матэрыяльнай стабільнасці, абароненасці. Калі чалавек фруструраваны ў гэтай сферы, той жа гемарой узнікае вельмі часта. Таму сярод пацыентаў шмат бізнесменаў з фінансавымі непрыемнасцямі, бухгалтараў, тых, хто звязаны з фінансамі. Усе мы рэагуем на праблемы — хтосьці сэрцам, хтосьці — печанню, а нехта — такім вось чынам.

***— Часта такія праблемы ўзнікаюць у цяжарных?***

— У 50—60 % жанчын. Па-першае, матка, павялічваючыся ў памерах, здаўлівае кішэчнік, часта ўзнікаюць запоры. Па-другое, цяжарныя мала п'юць, таму калавыя масы сухія. Па-трэцяе, матка здаўлівае вены, пагаршаецца венозны адток. Плюс змяняецца гарманальны фон, а вены вельмі адчувальныя да такіх змяненняў. Часта на фоне прыёму гарманальных кантрацэптываў узнікаюць праблемы са згушчанасцю крыві і гемароем.

***— Калі гемарой не лячыць, з ім можна жыць?***

— Чалавек будзе жыць, пакутуючы. На самай справе гемарой варта аперыраваць тады, калі ён надакучыў чалавеку, і той усведамляе, што хопіць трываць. Ёсць і абсалютныя паказанні да аперацыі: калі гэта частыя крывацёкі і анеміі, вялікія і частыя



трамбозы, наяўнасць значнага выпадзення, калі гемарой 3-й ці 4-й ступені. Ёсць шэраг людзей, якія пытаюць: «Доктар, я магу з гэтым жыць?» І жывуць. Вось такі іх выбар.

## Абследавацца на рак трэба пасля 50, а лепш — пасля 40

***— Сёння каларэктальны рак увайшоў у тройку лідараў сярод анкалагічных хвароб. Што яго выклікае?***

— Сярод практалагічных паталогій каларэктальнага раку, канешне, менш, чым гемарою і анальных трэшчын. Праўда, зараз хворых становіцца больш. На конт прычын развіцця каларэктальнага раку ёсць розныя даследаванні. Адны сцвярджаюць, што гэта хранічныя запоры і ўжыванне малой колькасці раслннай клятчаткі. Другі фактар — траплянне ў арганізм розных канцэрагенных рэчываў. Гэта актуальна для людзей, якія працуюць на розных шкодных вытворчасцях. Адыгрывае ролю і спадчыннасць. Я схільны думаць, што важны і наш спосаб мыслення. Два чалавекі працуюць на заводзе, але адзін хварэе на анкалогію, другі — не.

***— Якія нашы думкі могуць весці да раку?***

— Глыбокія затоеныя праблемы і незадаволенасць у жыцці, звязаная з бяспекай, абароненасцю, матэрыяльным дабрабытам. Вельмі часта — доўгае, хранічнае адчуванне трывогі і страху за сваё здароўе. Грамадства прывучыла нас, што трэба ўвесь час трывожыцца, і гэта вельмі дзіўная рэч. Узнікае замкнёнае кола: чалавек баіцца захварэць, з-за гэтага страху арганізм слабее, і ўзнікае цэлы каскад праблем. Чалавек з хваробай не можа справіцца, бо шмат чаго трэба змяніць у жыцці: адмовіцца ад шкодных звычак, думак, ілжывага мыслення і ўстановак. Як ні дзіўна, чалавек не павінен баяцца за сваё здароўе. Мы мусім жыць у стане напоўненасці і ўсведамляць, што з любой хваробай нам па сілах справіцца.

**«Як ні дзіўна, чалавек не павінен баяцца за сваё здароўе. Мы мусім жыць у стане напоўненасці і ўсведамляць, што з любой хваробай нам па сілах справіцца».**

***— У якім узросце варта пачынаць абследавацца на каларэктальны рак?***

— Пасля 50 гадоў кожны чалавек павінен праходзіць каланаскапію. Нават з 40 гадоў варта рабіць гэта абследаванне. Цяпер паліпоз кішэчніка, а гэта перадрак, амаладзіўся. Паліпы мы знаходзім у маладых людзей у 20—25 гадоў. Да іх узнікнення вядуць тыя ж фактары, што і да развіцця пухлін — магчыма, іанізуючае апраменьванне, ужыванне кансервантаў, спадчыннасць. Падчас каланаскапіі, калі паліп невялікі, яго можна адразу выдаліць. Праз год рэкамендуецца паўторная каланаскапія, каб упэўніцца, што паліпаў няма. Потым абследаванне варта праходзіць кожныя пяць гадоў. Калі паліпы былі знойдзены, то раз у тры гады.

***— Наколькі гэта агрэсіўны від раку?***

— Каларэктальны рак даволі агрэсіўны. Да 90 % пухлін прамой кішкі — адэнакарцэномы. Яны хутка разрастаюцца і метастазіруюць.

## Не аб'ядацца і не злоўжываць алкаголем

***— Ад чаго ўзнікаюць запоры?***

— Ад недастатковасці вады, расліннай клятчаткі і фізічнай актыўнасці. А таксама нашых шкодных думак. Запоры — характэрная праблема для людзей, якія цяжка развітваюцца з мінулым, цягнуць за сабой праблемы, утрымліваюць негатыўную інфармацыю, якую яны назапасілі.

***— Якой павінна быць фізічная актыўнасць пры той жа сядзячай рабоце? 11 тысяч крокаў у дзень, як зараз рэкамендуецца?***

— Мы павінны атрымліваць задавальненне ад таго, што робім. Калі нехта ведае, што яму трэба бегаць тры кіламетры ў дзень, каб не было запораў, і робіць гэта праз сілу, карысці няма. Лепш тады пайсці пагуляць з дзіцем на свежым паветры гадзіну ці нешта іншае. Варта самастойна знайсці той від актыўнасці, якая даспадобы, не абавязкова прытрымлівацца нейкіх строгіх рэкамендацый. Калі б чалавек атрымліваў задавальненне ад таго, што ён робіць, ад свайго жыцця, усё было б нашмат прасцей.

***— Як уплываюць на наш арганізм доўгія святы, напрыклад, Новы год?***

— Пасля Новага года, на жаль, мы назіраем усплёск гемараідальнай хваробы, вострых трамбозаў, абвастрэнняў.

***— Што мы няправільна робім?***

— Найперш злоўжываем спіртным. А таксама вострай ежай. Вельмі дрэнна на гемарой уплывае спалучэнне спіртнога і лазні. Таксама пры гэтай хваробе шкодзяць мяккія напоі — піва, віно. Яны ўзмацняюць ацёк у тканках. Трэба памятаць, што алкаголь выводзіць ваду, і тым самым садзейнічае запорам, выклікае іх і вялікая колькасць мяса. Важна не пераядаць, асабліва вострых страў.

***— Як не аб'есціся за святочным сталом?***

— Мы шмат ядзім, бо незадаволеныя, імкнёмся заесці сваю трывогу. І запіць яе алкаголем. Калі б мы елі роўна столькі, колькі нам неабходна, мы б менш хварэлі. Пазбавіцца ад трывогі — гэта цэлае мастацтва. Варта вучыцца знаходзіць баланс паміж тым, што патрэбна нам, і тым, што патрэбна соцыуму. Баланс вельмі тонкі, але любы чалавек у стане яго знайсці. Вельмі важна заняць сваё месца ў жыцці, і яно можа быць вельмі простае. Трэба ўсведамляць, што ў пагоні за вяршыняй можна наламаць дроў. Дайсці да яе, але па дарозе страціць вельмі многае. Калі чалавек знойдзе сваю нішу, нават самую простую, яму там будзе вельмі ўтульна, у яго не будзе крыўды, незадаволенасці, страху і іншых непатрэбных пачуццяў. Узамен з'явіцца задавальненне жыццём, мір і спакой у душы.

**Алена КРАВЕЦ.**



## Извещение о проведении торгов по продаже предприятий как имущественных комплексов, созданных на базе ОАО «Рыбный ряд»

| | |
|---|---|
| Организатор торгов | ЧУП «Антикризисная перспектива» (212026, г. Могилев, ул. Сурганова, 6, а/я 29, тел. +375296876609) |
| Продавец | ОАО «Рыбный ряд» (УНП 700067281) |
| Форма, дата, время и место проведения торгов | Первые повторные торги в форме аукциона **15.01.2019 года в 12.00** по адресу: г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16 |
| Сведения о предмете торгов, порядок ознакомления с ним | **Лот № 1:** предприятие как имущественный комплекс с регистр. № 0001323 (ОАО «Рыбный ряд») по адресу: г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16.<br>**Лот № 2:** предприятие как имущественный комплекс с регистр. № 0001411 (созданном на базе ОАО «Рыбный ряд» (рыбоперерабатывающий цех)). Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 8.30 до 17.00 по тел. 80296876609; 8029 3105283 |
| Начальная цена предмета торгов | Лот № 1: 1 463 400,00 бел. руб. без НДС;<br>лот № 2: 328 500,00 бел. руб. без НДС |
| Порядок проведения торгов | Сумма шага аукциона – 5 % от начальной цены каждого лота. Победителем торгов будет объявлено лицо, предложившее более высокую цену за предмет аукциона. В случае признания торгов несостоявшимися продажа предмета торгов единственному участнику, подавшему заявку на участие в торгах, либо единственному участнику, явившемуся для участия в них, при его согласии осуществляется по начальной цене, увеличенной на 5 %. Результаты торгов оформляются протоколом, который подписывается комиссией и победителем торгов в день проведения торгов. Договор купли-продажи подписывается в течение 10 рабочих дней с даты подписания протокола. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за 5 рабочих дней до наступления даты их проведения |
| Размер, порядок и сроки внесения задатка | Сумма задатка для участия в торгах – 10 % от начальной стоимости каждого лота.<br>Для участия в торгах необходимо в срок с 30.12.2018 до 12.00 14.01.2019 перечислить задаток по предмету торгов по следующим реквизитам: ОАО «Рыбный ряд», 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Нахимова, 16, УНП 700067281, р\с BY43BLBB30120700067281001001 в ЦБУ № 831 ОАО «Белинвестбанк» г. Бобруйск, ул. Пушкина, 198, БИК BLBBBY2X |
| Место и сроки приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов | Место и сроки приема заявлений на участие в торгах и прилагаемых к ним документов: заявление на участие принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.00 с 30.12.2018 до12.00 14.01.2019. К заявлению прилагаются: платежный документ с отметкой банка о внесении задатка; копии документов, подтверждающих юр. полномочия участников торгов: для юридических лиц – копия свидетельства о госрегистрации, устава; для ИП – заверенная копия свидетельства о госрегистрации; для физических лиц – копия паспорта. Порядок приема заявлений на участие в торгах: заявление на участие в аукционе направляются лицами, желающими принять участие в аукционе, по адресу: 213823, Могилевская область, г. Бобруйск, пер. Нахимова, д. 16. Копия направляется на эл. адрес:ruslan.myasoedov.74@mail.ru. Заявления, поступившие после 12.00 14.01.2019 года, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации. Заявления на участие в аукционе подаются по форме согласно приложению № 3 к приказу Министерства экономики Республики Беларусь от 29.11.2010 № 144. Участник аукциона и продавец (организатор торгов) заключают соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по продаже имущественного комплекса (приложение № 5 к Методическим рекомендациям). Отказ участников аукциона от участия в нем: участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать свое заявление на участие в нем. Неявка участника аукциона признается отказом от участия в аукционе. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором повторных торгов в течение пяти рабочих дней со дня проведения аукциона. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов: возмещение затрат на организацию и проведение аукциона производится победителем аукциона по фактическим затратам. В случае отказа или уклонения победителя аукциона от возмещения затрат на организацию и проведение аукциона результаты аукциона подлежат аннулированию, а внесенный им задаток возврату не подлежит. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником возможна продажа предмета торгов этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов |

## Объявление
### о созыве внеочередного общего собрания акционеров
### Уважаемые акционеры ОАО «Стройтрест № 35»

В связи с принятием решения Мингорисполкома от 06.12.2018 № 4992 «Об увеличении уставного фонда ОАО «Стройтрест № 35» Наблюдательный совет Общества **созывает 10 января 2019 года внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Стройтрест № 35»,** расположенного по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, 38.

Собрание пройдет по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, 38 (четвертый этаж), актовый зал.

**Повестка дня собрания:**

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Стройтрест № 35» путем проведения закрытой подписки на акции дополнительного выпуска.
2. О внесении изменения в Устав Общества.

С материалами, подготовленными к общему собранию, акционеры могут ознакомиться с 03.01.2019 по 09.01.2019 в рабочие дни с 9.00 до 17.00, 10 января 2019 г. – с 9.00 до 13.00 по адресу: г. Минск, ул. Я. Коласа, 38, в кабинете председателя Наблюдательного совета.

Регистрация участников собрания **с 13.00 до 14.45** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 10 января 2019 г. в 15.00.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию реестра на 29 декабря 2018 года.

**Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность (договор)!**

УНП 100289278

## Извещение о проведении 9 января 2019 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | |
|---|---|---|---|
| Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов | Местонахождение | Начальная цена с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
| «административное помещение» общей площадью 2008,7 кв. м с инв. № в ЕГРНИ 500/D-708150242; теплосчетчик SKU-01 с инв. № 462014; электросети 200 м К. Либкнехта, 70 с инв. № 01-169; сети водопровода d100 мм L23 м К. Либкнехта, 70 с инв. № 01-170; т/сети К. Либкнехта, 70 с инв. № 01-178 | г. Минск, ул. Карла Либкнехта, д. 70, пом. 27 | 1 082 396,13 | 108 000,00 |

**Продавец имущества:** ОАО «Минскремстрой», ул. Интернациональная, 5, 220030, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов**: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со статьями 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения торгов по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минскремстрой», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие с организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

При заключении договора купли-продажи недвижимого имущества ОАО «Минскремстрой» руководствуется своими имущественными интересами, уставом, локальными нормативными правовыми актами Общества, подходами по распоряжению государственным имуществом согласно Указу Президента Республики Беларусь от 4 июля 2012 г. № 294 «О порядке распоряжения государственным имуществом» и другими нормативными правовыми актами Республики Беларусь.

Торги проводятся 9 января 2019 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 26.12.2018 по 08.01.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:

(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);

(017) 226-41-14, (017) 200-04-11, (029) 688-61-94 (ОАО «Минскремстрой»)

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторного открытого аукциона (первоначальная стоимость снижена)

**Лот № 1:** капитальное строение с инв. № 710/С-59153 – административное здание, площадь – 968,2 кв. м. Капитальное строение с инв. № 710/С-59154 – гараж на 3 автомашины, площадь – 71,9 кв. м, капитальное строение с инв. № 710/С-77019 – забор. Объекты, входящие в состав Лота № 1, расположены по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Советская, д. 74, на земельном участке с кадастровым номером 741000000006001548, площадью – 0,1379 га

**Начальная цена продажи: 496 000,00 бел. руб. с учетом НДС.**
**Размер задатка: 49 600,00 бел. руб.**

**Дата, время и место проведения аукциона: аукцион состоится 29 января 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Последний день подачи заявок и внесения задатка: 28 января 2019 года до 15.00. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Расчетный счет для внесения задатка:** получатель платежа: РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Продавец:** ОАО «Спецмонтажстрой-179 г. Могилев», УНП 700012410, г. Могилев, Славгородское шоссе, 171, 47-60-02

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, тел. +375 222 72-41-14

**Порядок проведения аукциона:** лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч затраты на организацию аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 01.11.2018

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375 29 624-26-25; +375 29 550-09-56**



# Найлепшая гульня ў сезоне

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра трэцюю запар перамогу мінскага «Дынама» ў КХЛ і іншыя актуальныя падзеі выхадных.**

1. ***Беларускія спартсмены заваявалі сем узнагарод на XII Міжнародным турніры па плаванні «Кубак Уладзіміра Сальнікава».*** Лідар зборнай Ілья Шымановіч стаў чэмпіёнам турніру на каронных дыстанцыях 100 м і 50 м брасам. Аліна Змушко прынесла беларускай зборнай сярэбраны медаль у заплыве на 50 м брасам і бронзавую ўзнагароду на дыстанцыі 100 м аналагічным стылем. Яўген Цуркін падняўся на другую прыступку п'едэстала на дыстанцыі 100 м батэрфляем і стаў бронзавым прызёрам у заплыве гэтым жа стылем на 50 м.

Беларуская каманда ў складзе Віктара Стасяловіча, Алены Сяміжон, Ілы Шымановіча і Аліны Змушко ў змешанай эстафеце 4х50 м комплексным плаваннем заваявала сярэбраную ўзнагароду.

Турнір прайшоў у 25-метровым басейне. У спаборніцтвах прыняло ўдзел больш за 300 расійскіх спартсменаў.

2. ***Сяргей Новікаў перамог бразільца Гілберта Damінгеса ў прэстыжным паядынку па версіі Сусветнага баксёрскага савета (WBC) у Парамарыба (Сурынам).*** Паядынак праходзіў у вагавой катэгорыі 90,7 кг.

У першым раўндзе Сяргей Новікаў атрымаў перамогу тэхнічным накаўтам. Для беларуса гэта другая перамога на прафесійным рынгу. Раней ён трэніраваўся ў мінскім клубе «Залатыя пальчаткі», таксама быў членам нацыянальнай каманды па боксе. На чэмпіянаце Еўропы ў 2013 годзе ў Мінску Сяргей Новікаў заваяваў бронзавую ўзнагароду ў вагавой катэгорыі 81 кг. Цяпер беларускі спартсмен перайшоў у прафесійны бокс, жыве і трэніруецца ў ЗША ў вядомага коўча Пэдра Дыяса.

3. ***Хакеісты мінскага «Дынама» абыгралі трохразовага ўладальніка Кубка Гагарына казанскі «Ак Барс» — 3:2.*** Закінутыя шайбы на рахунку Аляксея Цярэшчанкі, Сяргея Касціцына і Дзмітрыя Буйніцкага.



Фота БелТА.

«Гэта найлепшая гульня ў нашым выкананні ў бягучым сезоне. На мой погляд, пераломным у матчы стаў момант у другім перыядзе, калі выстаялі ўтрох супраць пяцёркі саперніка», — адзначыў пасля гульні **галоўны трэнер мінчан Андрэй СІДАРЭНКА.**

Пасля 40 матчаў у бягучым сезоне ў актыве мінскага «Дынама» 28 ачкоў. Чарговыя матчы чэмпіянату КХЛ «зубры» правядуць на выездзе супраць чэлябінскага «Трактара» (26 снежня), «Аўтамабіліста» (28 снежня), а завершыцца серыя 30 снежня сустрэчай з яраслаўскім «Лакаматывам».

4. ***Валейбалісткі «Мінчанкі» прайгралі краснадарскаму «Дынама» з лікам 0:3 у дамашнім матчы адкрытага чэмпіянату Расіі.*** У пяці папярэдніх сустрэчах беларускі атрымалі адну вікторыю і, набраўшы пяць балаў, знаходзяцца на 10-м месцы сярод 12 удзельнікаў турніру. Лідзіруе калінінградскі «Лакаматыў», у якога 18 балаў пасля сямі матчаў, па 14 ачкоў маюць краснадарскае і маскоўскае «Дынама», якія згулялі на матч менш.

Свой наступны паядынак у расійскай суперлізе валейбалісткі «Мінчанкі» правядуць сёння ў Краснаярску супраць мясцовага «Енісея», які мае шэсць ачкоў і займае дзявятае месца.

5. ***Гандбалісты зборнай Беларусі завершаць 2018 год матчамі ў Катары, а ў пачатку студзеня згуляюць на турніры ў Іспаніі.***

На вучэбна-трэніровачны збор для падрыхтоўкі да маючых адбыцца сустрэч галоўны трэнер беларускай каманды Юрый Шаўцоў выклікаў 20 гандбалістаў: варатары — Вячаслаў Салдаценка («Канстанца», Румынія), Іван Мацкевіч (БГК імя Мяшкова, Брэст); палявыя гульцы — Андрэй Юрынок, Максім Баранаў, Сяргей Шыловіч, Арцём Кулак (усе — БГК імя Мяшкова), Іван Броўка, Мікіта Вайлупаў, Вячаслаў Бохан, Мікалай Алёхін, Дзмітрый Хмялькоў, Дзмітрый Нікуленкаў (усе — СКА, Мінск), Арцём Каралёк, Уладзіслаў Кулеш (абодва — «Віве», Кельцы, Польшча), Юрый Лук'янчук («Рыіхімякі», Фінляндыя), Вадзім Гайдучэнка («Сэн-Рафаэль», Францыя), Аляксей Шынкеля («Матор», Запарожжа, Украіна), Артур Карвацкі («Балатонфюрэд», Венгрыя), Аляксандр Падшывалаў («Міндэн», Германія).

Сёння і 28 снежня нашы гандбалісты правядуць два таварыскія матчы ў гасцях у зборнай Катара, а 5—7 студзеня 2019 года ў іспанскай Паленсіі прымуць удзел у міжнародным турніры разам з камандай гаспадароў і гандбалістамі Польшчы і Саудаўскай Аравіі.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Гардэроб

# У чым сустракаць Новы год?


Белая кашуля — ваша палачка-выручалачка на любы выпадак.


Сукенка ў паеткі (бліскаўкі) ідэальна падыдзе для свята.


Пры выбары камбінезона аддайце перавагу мадэлям з шырокімі штанамі.

**У святочную ноч хочацца выглядаць на ўсё сто. І не важна — сустракаеш ты Новы год у рэстаране ці ў гасцях. Як скласці ўдалы вобраз? Модныя падказкі дае імідж-стыліст міжнароднага класа Вольга ЯКУШАВА.**

## КОЛЕР НАСТРОЮ

2019-ы — год Жоўтага Кабана. Астролагі раяць выбраць убор менавіта ў гэтым колеры і яго адценнях: залатым, лімонным, канарэечным. Але эксперт перасцерагае: не спяшайцеся так рабіць.

— Большасць жыхароў нашай краіны маюць славянскую знешнасць — русыя валасы, светлыя вочы і светлую скуру. Усе адценні жоўтага — не самыя выйгрышныя для такога тыпу знешнасці. Яны могуць падкрэсліць зелень ці сінь скуры. А таксама зробяць больш заўважнымі ўзроставыя змены і сляды стомленасці. Жоўтыя адценні пасуюць тым, у каго пігмент скуры і валасоў цёплы — усе рыжавалосыя (не фарбаваныя) і залатавалоскі. Хоць для халоднага каларыту, да якога адносіцца славянскі тыпаж знешнасці, выйгрышным можа быць выбар светла-лімоннага колеру — але пры наяўнасці дагледжанай скуры.

Астатнім прапануем прыглядзецца да іншай гамы. Большасці падыдуць такія колеры, як цёмна-сіні, серабрыста-шэры (асабліва ў бліскучых тканінах) і малочны.

## ЯРКА ЦІ ПРАКТЫЧНА?

Каб не адставаць ад модных тэндэнцый, выберыце сукенку ў паетках (бліскаўкі) ці з пяром страуса. Такі дэкор ідэальны для свята. Хочаце купіць штосьці больш універсальнае, каб потым гэта можна было насіць у паўсядзённым жыцці? Тады ваш варыянт — белая кашуля і спадніца любой даўжыні з такіх матэрыялаў, як шоўк, аксаміт, парча. Кашулю можна заправіць спераду — гэта візуальна падоўжыць ногі. Калі ж пакідаеце яе на спадніцу, паспрабуйце перавязаць тонкім раменьчыкам, каб падкрэсліць талію.

Для тых, хто не любіць сукенкі, альтэрнатывай стане камбінезон ці шырокія штаны-палаца ў спалучэнні з той жа белай кашуляй. Або офісныя штаны-дудачкі і прыгожы топ у паеткі.

## ДЭТАЛЁВЫ ПАДЫХОД

— Асноўнае правіла: чым ярчэйшы ўбор і чым больш на ім дэкору, тым мінімалістычнейшыя павінны быць упрыгажэнні. І наадварот — пры простых паўсядзённых рэчах можна дазволіць сабе якія заўгодна «сакавітыя» аксесуары, — нагадвае Вольга Якушава. — Але важна ўлічваць іх маштаб: пры мініяцюрнай фігуры аддаём перавагу больш дробным упрыгажэнням, пры буйным целаскладзе — вялікім.

Аднатонны касцюм можна дапоўніць масіўнымі завушніцамі і бранзалетам. Незвычайны ход — павязаць хустку як чалму: атрымаеце багемны вобраз. У выпадку з белым уборам можна абысціся і без аксесуараў — гэты колер ужо сам па сабе ўражвае і добра глядзіцца ў мінімалістычным акружэнні.

## АДРАЗУ «НЕ»

Стыліст настойліва рэкамендуе не выбіраць для навагодняй вечарынкі трыкатаж (асабліва грубай вязкі) і рваныя джынсы (якія да таго ж ужо сталі антытрэндам). Іншая распаўсюджаная памылка — надзець усё яркае і найлепшае адразу.

— Лепш недабраць, чым перабраць. Так не з'явіцца сумненняў у вашым добрым гусце.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.28 | 16.52 | 7.24 |
| Віцебск — | 9.25 | 16.34 | 7.09 |
| Магілёў — | 9.18 | 16.42 | 7.24 |
| Гомель — | 9.06 | 16.47 | 7.41 |
| Гродна — | 9.42 | 17.09 | 7.27 |
| Брэст — | 9.34 | 17.18 | 7.44 |

## Месяц

*Поўня 22 снежня.*
*Месяц у сузор'і Дзевы.*

## Імяніны

***Пр.** Аляксандра, Аркадзя, Івана, Лукі, Мікалая.*
***К.** Дзіянізія, Сцяпана.*


Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Мікалай прызнаўся жонцы, што здрадзіў ёй і што выйграў мільён долараў.**
**Жонка вельмі пакрыўдзілася, але не сышла.**

— Ты б хацеў раптам апынуцца ў будучыні?
— Так.
— Тады вось: я тут тры літры прынёс...

**Стрытрэйсер, які трапіў у пекла, атрымлівае для гонак дарожны асфальтаўкладчык.**

Калі жонка едзе за рулём і паварочвае не туды, нават навігатар кажа:
— Ну ў прынцыпе, можна і так...

**Закахаўся. Усвядоміў, што раней праблем у мяне не было...**

Дзеці — кветкі жыцця :)
Маша, 4 гады. Доўга слухае, як спрачаюцца мама і тата, а потым кажа:
— Тата, рабі як хочаш, але толькі так, як мама сказала.



caricatura.ru

Даты | Падзеі | Людзі

**26 СНЕЖНЯ**

У краіне

**1893** год — нарадзіўся (г. Санкт-Пецярбург) Яўген Карлавіч Цікоцкі, кампазітар, народны артыст Беларусі і СССР. Адзін з заснавальнікаў беларускай прафесійнай музыкі. Сярод твораў оперы «Міхась Падгорны», «Алеся», музычная камедыя «Кухня святасці», араторыя «Вызваленне», хоры, рамансы, песні, апрацоўкі народных песень, музыка да спектакляў і кінафільмаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 1970 годзе.

**1925** год — нарадзіўся (вёска Гімбатаўка Мсціслаўскага раёна) Віктар Іванавіч Семянкоў, вучоны-правазнавец, член-карэспандэнт НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Аўтар больш як 300 навуковых прац, у тым ліку 13 манаграфій. Даследаванні па гісторыі працоўнага права і заканадаўстве аб ахове працы, наглядзе і кантролі за выкананнем заканадаўства аб працы. Шэраг работ прысвечаны пытанням дзяржаўнага будаўніцтва, гісторыі дзяржавы і права Беларусі. Узначальваў аўтарскі калектыў па падрыхтоўцы да выдання чатырох Каментарыяў да Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Браў удзел у распрацоўцы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (1994), іншых нарматыўна-прававых актаў. У 2001 годзе Міжнародны біяграфічны цэнтр у Кембрыджы (Вялікабрытанія) прысвоіў вучонаму ганаровае званне «Чалавек года». Памёр у 2015 годзе.



**1926** год — выйшаў на экран першы беларускі мастацкі фільм «Лясная быль» (рэжысёр Юрый Тарыч).

**1932** год — адкрыта першая ў Беларусі транспартная авіялінія Мінск—Глуск—Парычы—Мазыр.

У свеце

**1893** год — нарадзіўся Маа Цзэдун, кітайскі партыйны, палітычны і дзяржаўны дзеяч, адзін з заснавальнікаў Камуністычнай партыі Кітая, галоўны тэарэтык мааізму, стваральнік сучаснай кітайскай дзяржавы. Памёр у 1976 годзе.

**1898** год — П'ер Кюры і Марыя Складоўская-Кюры, французскія вучоныя-фізікі, паведамілі аб адкрыцці імі новага хімічнага элемента — радыю. За даследаванне радыеактыўнасці і адкрыццё радыю вучоныя ўдастоены Нобелеўскай прэміі па фізіцы (1903).

**1943** год — нарадзіўся Валерый Міхайлавіч Прыёмыхаў, савецкі і расійскі акцёр, рэжысёр, сцэнарыст, заслужаны дзеяч мастацтваў Расійскай Федэрацыі. Здымаўся ў фільмах «Пацаны», «Халоднае лета пяцьдзясят трэцяга...», «Каменская» і інш. Двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Расіі. Памёр у 2000 годзе.

**1946** год — савецкі знішчальнік Ла-176, пілатуемы капітанам А. В. Сакалоўскім, упершыню ў свеце пераадолеў хуткасць гуку.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4535.
Нумар падпісаны ў 19.30 25 снежня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12